# І КНІГА ТАКСАМА ВАЯВАЛА...

Прашытыя чэргамі фашысцкіх кулямётаў, прабітыя снараднымі асколкамі кнігі, якія беражліва дасталі са спецыяльнага сховішча Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна... Як раненыя, але не пакораныя ворагам салдаты, яны зноў занялі ў гэтыя дні баявы пост на стэлажах адкрытай тут экспазіцыі «так пачыналася вайна». Выстаўка прымеркавана да 50-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Аб многім расказалі б прастрэленыя, пажаўцелыя ад часу фаліянты, калі б маглі гаварыць. Аб тым, напрыклад, як карпатліва і настойліва збіралі іх па ўсёй краіне супрацоўнікі «Ленінкі» перад вайной. Як, не паспеўшы абжыцца ў фондах, гарэлі яны ад гітлераўскіх бомб, што абрушыліся ў першы ж дзень вайны на мірны Мінск. Нямногія з цудам уцалелых кніг перажылі ваенную пагрозу ў патаемных месцах на мінскіх гарышчах і ў падвалах. Але былі і такія, якія пракурыліся дымам партызанскіх кастроў, абтрапаліся ў пахсдных рэчмяшках салдат і афіцэраў-франтавікоў. Так, кнігі ваявалі, саграваючы цяплом сваіх радкоў стомленых байцоў. І тыя пранеслі іх праз агонь, каб вярнуць да папялішча галоўнай бібліятэкі рэспублікі. Каб пачала яна адраджацца амаль з нуля...

Юбілейную экспазіцыю — своеасаблівы кніжны летапіс вайны — арганічна дапаўняюць плакаты франтавой пары, сярод якіх славуты «Радзіма-маці кліча!» і іншыя, выданні аб Вялікай Айчыннай на замежных мовах.

**Л. ТРАЦЭЎСКІ,**
**кар. БЕЛТА.**